Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 ЖНІЎНЯ 2007 г. СУБОТА

№ 155 (26020)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ДА РЭФАРМАВАННЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ТРЭБА ПАДЫХОДЗІЦЬ АСЦЯРОЖНА»

**Новы мост цераз Днепр — значны ўклад у рэалізацыю праграмы развіцця малых гарадоў і пасёлкаў. Гэта адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора на цырымоніі адкрыцця моста цераз раку Днепр, які злучае горад Копысь Аршанскага раёна і вёску Александрыя Шклоўскага раёна.**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, новы мост з'яўляецца добрым падарункам не толькі для гэтых населеных пунктаў, але і для ўсёго Прыдняпроўскага краю. Два гады таму, наведваючы Шклоўскі раён, Прэзідэнт даў даручэнне да 1 верасня 2007 года пабудаваць у сціслыя тэрміны добры мост. Многія тады не верылі ў ажыццяўленне гэтага праекта. Даручэнне Прэзідэнта выканана. Прэзідэнт адзначыў, што ўсе значныя навабудоўлі ў краіне знаходзяцца пад пастаянным кантролем дзяржавы. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, важны гэты аб'ект і для эканомікі прыбярэжных раёнаў дзвюх абласцей.

Прэзідэнт сказаў, што цяпер адкрываюцца больш шырокія магчымасці для выкарыстання багатага гістарычнага, культурнага, прыроднага патэнцыялу мясцовых населеных пунктаў. Многія з малых гарадоў, як напрыклад, Копысь, Шклоў, вёска Александрыя маюць багатую гісторыю, немалы патэнцыял для свайго развіцця.

Прэзідэнт перакананы, што ўзвядзенне новага моста цераз Днепр будзе таксама садзейнічаць развіццю аграэкатурызму, у тым ліку з прыцягненнем замежных гасцей. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што для развіцця аграэкатурызму ёсць усе неабходныя ўмовы — цудоўная прырода, маляўнічыя ландшафты, размешчаная непадалёку ў Ляўках дача Янкі Купалы з літаратурным музеем.

Кіраўнік дзяржавы пазітыўна ацаніў работу па праектаванню і будаўніцтву моста калектывамі многіх прадпрыемстваў і арганізацый і падзякаваў працаўнікам за работу. У прыватнасці, «Белдзіпрадар» распрацаваў праектна-каштарысную дакументацыю. Асноўныя будаўнічыя работы правялі «Мостатрад № 4250» і Віцебскі дарожна-будаўнічы трэст № 1.

Дзяржаўная падтрымка прадпрыемстваў малых і сярэдніх гарадоў будзе аказвацца толькі на фазе будаўніцтва, а не пасля таго, як прадпрыемствы пачало працаваць. Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні журналістаў.

«На сённяшні дзень мы ўкладваем грошы ў будаўніцтва эфектыўных экспартаарыентаваных прадпрыемстваў. Ім наша падтрымка не патрэбна», — сказаў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «прыватнаму бізнесу няма чаго баяцца, таму што прыватнік, як сёння хоча загрэбці грошы, пойдзе арганізоўваць бізнэс у малых гарадах і вёсках, хоць бы з-за таго, што падаткі тут меншыя і рабочая сіла таннейшая».

«Пасля таго як прадпрыемства пачало дзейнічаць, мы акажам яму дапамогу толькі ў тым выпадку, калі гэта неабходна з пункту гледжання падтрымкі людзей», — дадаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён нагадаў, што развіццё вытворчасці ў Копысі пачыналася тады, калі ў гэтым сёлку было больш 100 беспрацоўных, а на сённяшні дзень іх толькі два.

«Вось так скрупулёзна мы будзем падыходзіць да вырашэння праблем малых гарадоў. Тут ёсць і прыгажосць, і ўмовы для жыцця, але мы павінны абавязкова дапамагчы людзям з забеспячэннем жыллём і арганізацыяй вытворчасці», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

У Беларусі і Расіі пакуль няма такіх пытанняў, якія неабходна абмяркоўваць на вышэйшым узроўні, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні журналістаў у гарадскім пасёлку Копысь Аршанскага раёна адносна яго быццам бы маючай адбыцца сустрэчы з Уладзімірам Пуціным у Сочы.

«Калі б мы збіраліся сустрэцца 22 жніўня, беларускія СМІ паведамілі б, што рыхтуецца такая сустрэча, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Пакуль няма тых пытанняў, якія мы маглі б абмеркаваць на вышэйшым узроўні згодна з той канцэпцыяй, якая намі ўзгоднена апошнім часам. Мы сустракаемся, калі з'явіліся 2—3 буйныя пытанні або ёсць надзвычайныя пытанні...»

Беларускі лідар адзначыў, што для такіх абмеркаванняў у нас дастаткова формаў, у прыватнасці, Вышэйшы Дзяржаўны Савет. «Думаю, мы можам восенню правесці пасяджэнне ВДС, абмеркаваць усе пытанні, якія існуюць не толькі паміж прэзідэнтамі, але і на ўзроўні ўрадаў», — сказаў Прэзідэнт.

«Калі нам трэба сустрэцца з Уладзімірам Пуціным, гэта пытанне аднаго дня, сазваліліся, дамовіліся, сустрэліся і абмеркавалі праблемы. Пакуль такіх праблем няма», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Адмова ад прывязкі беларускага рубля да расійскага не паўплывае на стабільнасць эканомікі Беларусі, заявіў Прэзідэнт краіны.

«Наша фінансавая сістэма «нестабільная» толькі для дамарослых эканамістаў-апазіцыянераў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Эканоміка Беларусі не абрушыцца, і я ўжо гаварыў вам аб гэтым і тры, і дзесяць гадоў таму і гавару аб гэтым цяпер».

У сваю чаргу, Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч растлумачыў, што адмова ад прывязкі да курсу расійскага рубля з'яўляецца чыста тэхнічным пытаннем. «Раней існавала прывязка беларускага рубля адразу да двух валют — расійскага рубля і долара ЗША. Але практыка паказала, што больш эфектыўнай будзе прывязка да адной валюты», — растлумачыў ён.

Беларусь з'яўляецца суверэннай, незалежнай дзяржавай, і ёй не патрэбны важакі, падобныя на польскіх чыноўнікаў, якія спрабавалі, насуперак афіцыйнай забароне на ўезд у нашу краіну, перасекчы беларускую граніцу, заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Затым кіраўнік дзяржавы наведаў ААТ «Александрыйскае» ў Шклоўскім раёне. Гаспадарка можа стаць узорам для рэарганізацыі сельскагаспадарчых комплексаў у Беларусі, заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Тут мы бачым прыклад тыповай буйной гаспадаркі плошчай амаль 10 тыс. га, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Па падобнай мадэлі павінны быць арганізаваны сярэднія (прыкладна 6—7 га) і невялікія (прыкладна 2 тыс. га і меншыя) гаспадаркі».

«Невялікія гаспадаркі можна паступова аддаваць прыватнікам, таму што практыка паказала, што стратныя сельгаспрадпрыемствы, якія мы перадалі ў прыватныя рукі, сталі вельмі рэнтабельнымі», — сказаў Прэзідэнт.

Да рэфармавання сельскагаспадарчых прадпрыемстваў трэба падыходзіць асцярожна, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Галоўнае — не наламаць дроў. У нашай гісторыі былі прыклады, калі сялян агульна раскулачвалі, а затым хацелі агульна раздрабніць аграпрамысловы комплекс на фермерскія гаспадаркі, — сказаў Прэзідэнт. — Таму не трэба вельмі спяшацца ні дзяліць, ні ўзбуйняць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы».

«Мы на прыкладзе Расіі бачым, што было б, калі б мы пайшлі па шляху татальнай прыватызацыі сельскай гаспадаркі. У нас краіны не было б», — сказаў Прэзідэнт. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «трэба забыць пра экстэнсіўны шлях развіцця сельскай гаспадаркі і ісці выключна інтэнсіўным шляхам».

**БЕЛТА.**




## Сёлета яблыкі сталі дэфіцытнай садавінай, і закупачная цана на іх павысілася ўдвая

**У Магілёўскай вобласці поўнай хадой ідзе нарыхтоўка яблыкаў. Пасля мінулагодняга выдатнага ўраджаю яны сёлета, як і чакалася, не ўрадзілі. Нарыхтоўшчыкам спажывецкай кааперацыі цяпер даводзіцца літаральна вышукваць месцы, дзе можна набыць у насельніцтва гэту садавіну. З Магілёўскага раёна ездзяць па яблыкі ў Быхаўскі, з Бялыніцкага — увогуле на Гомельшчыну. Праўда, бялыніцкім кааператарам пашанцавала: ёсць у раёне паселішчы, дзе яблыкі ў гэтым годзе сабраць можна.**

Вёска Ермалавічы Бялыніцкага раёна нібыта падзелена на дзве часткі: у адной — стэрыльныя, як тут кажуць, сады, а ў другой дрэвы ломяцца ад яблык. Вяскоўцы нагадваюць прыродную заканамернасць: атрымліваецца год на год не прыходзіцца, і сёлета прыйшла чарга вясковага пасёлка Мінёры, дзе гаспадары трох дзесяткаў падворкаў цяпер актыўна здаюць свой ураджай кааператарам. У мясцовай краме тавараў паўсядзённага попыту штодня прымаюць яблыкі. Мужчыны разгружаюць фурманку і кладуць мяхі яблыкаў на вагі. Груз Мікалая Марозава зацягнуў на 172 кілаграмы. Адзін кілаграм яблыкаў прымаюць цяпер па 200 рублёў, так што прыбытак нядрэнны.

— Я ўжо здаў яблыкаў тысяч на 100, — гаворыць мужчына. — У нас ёсць стары сад, які яшчэ нашы дзяды садзілі. І сёлета столькі яблыкаў, што іх няма куды падзець. Каб не пагнілі, трасём, збіраем і возім у краму. Пакідаем толькі няшмат на варэнне і кампоты. На атрыманыя грошы набываем харчы і школьныя прылады.

10-гадовы Мікітка частуе «белым налівам». Ён дапамагаў бацьку збіраць яблыкі і цяпер лагічна разлічвае на ўзнагароджанне. Атрымаўшы два піражкі з мясам і шакаладны батончык, малы ў захапленні пабег частавацца чэсна заробленымі прысмакамі.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## Попыт на беларускае малако і масла на біржавых таргах значна перавышае прапанову

**У апошнія месяцы «рэзка праявілася цікавасць да беларускага масла жывёльнага і сухога абястлушчанага малака», якія зараз рэалізуюцца праз Беларускую ўніверсальную таварную біржу. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Міхаіл Савельеў.**

Ён дадаў, што зараз беларускіх вытворцаў «задавальняюць цэны» пры рэалізацыі праз біржу. Сярэдні кошт продажу малака сёння складае 4,2 долара ЗША за кілаграм. «Летась ён быў значна ніжэйшым — не даходзіў да 3 долараў». Масла зараз прадаецца па 3,8 долара.

З 20 жніўня, як адзначыў Міхаіл Савельеў, упершыню будзе зроблена спроба таргоў мясам праз біржавыя таргі. Пры гэтым намеснік міністра дадаў, што сёння «на таргах попыт на нашу прадукцыю значна перавышае прапанову». Намеснік міністра сказаў таксама, што Беларусь падрыхтавала спіс з пяці малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў, якія маглі б пастаўляць прадукцыю ў ЕС. Спіс перададзены ў адпаведныя структуры ЕС. Разгляд пытання запланаваны на студзень 2008 года. Пры гэтым прадпрыемствы, якія трапілі ў спіс, будуць інспектавацца экспертамі ЕС. «Каб быць гатовымі да інспектарскай праверкі Еўрасаюза, неабходна прывесці ў адпаведнасць дзяржстандарты па малочных прадуктах са стандартамі ЕС. Чаму мы выбіраем менавіта параметры стандартаў Еўрасаюза? Бо лічым, што яны найбольш жорсткія ў гэтым напрамку».

На канец жніўня — пачатак верасня намечана інспекцыя расійскім бокам беларускіх заводаў па перапрацоўцы малака. «Гэта нармальная з'ява, калі спажывец хоча ведаць, у якіх умовах ажыццяўляецца вытворчасць прадукту, і вызначыць крыніцу сыравіны, якая паступае на гэтае перапрацоўчае прадпрыемства».

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**


КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже административно-производственного здания (общ. пл. 734, 8 кв.м), расположенного по адресу: г. Орша, ул. Белинского, 1а. Площадь земельного участка 0,2240 га. Начальная цена снижена на 10 % и составляет 239 540 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.06.2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 28.08.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 27.08.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, 2809695.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**



МОУП «Автопромторгагросервис» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводят открытый аукцион по продаже объектов, расположенных по адресу: Смолевичский р-н, 13 км автодороги Слобода — Новосады, в том числе: ЛОТ № 1 — автозаправочная станция в составе: здание АЗС (общ. пл. 151,7 кв.м), очистные сооружения, заправочные островки (4 шт.), резервуары 50 м куб. (7 шт.), резервуар 5 м куб., заасфальтированные проезды и площадки общ. пл. 2990 кв.м, насосная станция, ограждение, рекламная конструкция, мойка-автомат, холодильная камера, компрессор до 1 МПа (10 атм.), станок балансировочный, колонки заправочные (4 шт.), терминал кассовый, АЙИСУТПОН «Берлио» (кассовая система), принтер матричный, факс-модем «ZyXELOmni56K», подъемник автомобильный. Начальная цена лота с НДС – 320 960 000 бел. руб. ЛОТ № 2 — станция технического обслуживания в составе: здание СТО (общ. пл. 258 кв.м), эстакада, подъемник автомобильный (2 шт.), компрессиметр, стенд шиномонтажный, стенд регулировочный, полуавтомат сварочный, установка моечная «Эванур», газоанализатор. Начальная цена лота с НДС — 59 944 000 бел. руб. Задаток в размере 5% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Переход права пользования земельными участками будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 18.09.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.09.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**КОНТАКТНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ: (8017) 224-61-34, 289-85-55, (801776) 55-669**
**САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY**


## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### А Ў НАС ГАЗ...

**Аб гэтым з поўным правам гавораць сёння жыхары гарадскога пасёлка Камарын, што ў Брагінскім раёне.**

Бо яго, як нам паведаміла прэс-служба Гомельскага аблвыканкама, атрымалі 464 сям'і гэтага населенага пункта і вёскі Краснае дзякуючы таму, што закончылася будаўніцтва газаправода высокага ціску ад райцэнтра працягласцю 59 кіламетраў, які быў узведзены па Даручэнню Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі ў час яго паездкі ў Гомельскую вобласць у красавіку мінулага года.

Аб'ект пабудаваны за 9 месяцаў замест нарматыўных 34. Акрамя Камарына і Краснага, газ атрымаюць яшчэ 15 вёсак і пасёлкаў, якія знаходзяцца на трасе газаправода. Але гэта — у перспектыве.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### МЕДЫКІ — НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ

Суд першай інстанцыі абвінаваціў урача і медыцынскую сястру бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, што ў Гомелі, у халатнасці, якую яны дапусцілі ў адносінах да 35-гадовага пацыента. У выніку чалавек памёр, бо не атрымаў патрэбных медыкаментаў і працэдур, а экстранныя меры для яго выратавання аказаліся запозненымі. Урач прыгавораны да трох гадоў пазбаўлення волі, а медсястра — да двух з паловай.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### ТАДЫ ЛІЧЫЦЬ МЫ СТАЛІ РАНЫ...

**Наша газета паведамляла, што ад удару маланкі ў Івацэвіцкім раёне загінуў чалавек. Але гэта, на жаль, не адзіная ахвяра навальніцы.**

Праз дзень разрад нябеснай электрычнасці смяротна параніў 25-гадовага хлопца ў Давід-Гарадку Столінскага раёна. Стыхія прынесла шмат бяды людзям. Згарэла хата з усім нажытым у пенсіянеркі з вёскі Капылы Камянецкага раёна. У вёсцы Каленкавічы гэтага ж раёна пазрывала стрэхі з дамоў і гаспадарчых пабудоў. Без даху застаўся і сельсавет. Значны ўрон нанесла бура пабудовам у вёсках Вярховіцкага сельсавета. Моцна пацярпелі ад ураганнага ветру дзве школы ў Івацэвіцкім раёне. У Стайкаўскай школе знесла 150 лістоў шыферу, а школа № 3 Івацэвічаў пасля ўрагану аказалася наогул без даху. Урон у апошнім выпадку склаў больш за 70 млн рублёў. Зараз паўсюдна вядзецца работа па ліквідацыі наступстваў стыхіі.

**Яна СВЕТАВА.**

### БЕНЗІН ДЛЯ НАЧАЛЬНІКА

**Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, у Віцебску была ўзбуджана крымінальная справа ў адносінах да начальніка аднаго з аддзяленняў Беларускай чыгункі і вадзіцеля гэтай арганізацыі.**

Як мяркуецца, падазроныя выкралі са службовага аўтамабіля 550 літраў бензіну А-92. Аналагічнае злачынства выяўлена ў адносінах прадстаўніка Полацкай авіякампаніі, які выкраў амаль 700 літраў дызпаліва. А вось супрацоўнікі УУС Магілёўшчыны «тармазнулі» ў Бабруйску службовую асобу мясцовага камунальнага прадпрыемства, які на працягу года набраў «зайздросную скорасць» па папаўненню ўласнай кішэні, падтасоўваючы дакументацыю. Гэты дзялок падазраецца ў тым, што ўчыніў крадзеж 35 млн рублёў, уносячы фіктыўныя даныя ў акты прыёму і здачы работ па ўстаноўцы індывідуальных прыбораў уліку расходу вады ў кватэрах грамадзян.

Дарэчы, за сем месяцаў гэтага года органамі ўнутраных спраў за незаконнае абарачэнне ў рэспубліцы нафтавага вадкага паліва складзена 265 адміністратыўных пратаколаў, спагнана штрафаў на суму каля 53 млн рублёў і канфіскавана больш за 530 тысяч літраў нафтапрадуктаў на 603 млн рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПОЕЗД НАЕХАЎ НА ЦЯЛЯТ

Раніцай паблізу гарадскога пасёлка Лёзна грузавы поезд № 2692 сутыкнуўся з нечаканай перашкодай — статкам цялят. Здарэнне зафіксавана каля сямі гадзін раніцы: жывёліны выбеглі на чыгуначнае палатно, і размінуцца з імі поезд не меў ніякай магчымасці. У выніку інцыдэнту загінула пяць цялят, а затрымка руху поезда склала тры гадзіны.

**Аляксей ЦІТОЎ.**

### ПАЎТАРЫ ТОНЫ ПАДРОБКІ

**Амаль паўтары тоны недобраякаснай мясной прадукцыі канфіскавана праваахоўнікамі ў дзвюх мінчанак, якія не супраць былі «пачаставаць» ёй пакупнікоў на рынку.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадзянскіх сувязяў МУС, беспрацоўная жыхарка сталіцы, а таксама прадавец у індывідуальнага прадпрымальніка рэалізоўвалі сумніўнай якасці прадукт на тэрыторыі ГД «Ждановічы». А каб тавар лепш збываўся, жанчыны нанеслі на яго маркіроўку беларускіх вытворцаў. Канфіскаваная прадукцыя «пацягнула» амаль на 10,5 млн рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**


МОУП «Автопромторгагросервис» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводят открытый аукцион по продаже объектов, расположенных по адресу: Борисовский р-н, Московское шоссе, Кальвария, в том числе: ЛОТ № 1 — автозаправочная станция в составе: здание АЗС (общ. пл. 204 кв. м), очистные сооружения, заправочные островки с навесом, пожарный резервуар, резервуар 10 куб. м (2 единицы), резервуар 25 куб. м (8 единиц), ограждение с фундаментом, трансформатор масляный ТМ-160. Прилегающая к объекту территория общ. пл. 1907 кв.м заасфальтирована. Начальная цена лота с НДС – 307 401 800 белорусских рублей; ЛОТ № 2 — станция техобслуживания в составе: здание СТО (общ. пл. 99,7 кв. м), пристройка к зданию СТО (общ. пл. 12,8 кв. м). Прилегающая к объекту территория общ. пл. 339 кв. м заасфальтирована. Начальная цена лота с НДС – 179 495 700 белорусских рублей. Задаток в размере 1% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельными участками будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 18.09.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.09.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**КОНТАКТНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ: (8017) 2246134, (80177) 722502.**
**САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY**


## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПЕРУ: КОЛЬКАСЦЬ АХВЯР ВЫРАСЛА ДА 510 ЧАЛАВЕК



Паводле інфармацыі перуанскай выратавальнай службы, колькасць загінулых складае ад 500 да 510 чалавек. Як паведамляюць інфармагенцтвы, пацярпелых яшчэ мінімум 2000.

### РАСІЯ НА ПАРОЗЕ НОВАГА ДЭФОЛТУ?

**Дзевятую гадавіну капітуляцыі перад сусветным фінансавым крызісам 1997—1998 гадоў Расія сустрэла пагрозай новага дэфолту, лічаць аналітыкі.**

Зараз, калі сусветныя фінансавыя рынкі «ліхаманіць», расійская эканоміка моцная як ніколі, супакойваюць «Ведомости». Але яны бачаць пагрозу з іншага боку: Расія паспела інтэгравацца ў сусветную эканоміку і страціла імунітэт да глабальнага крызісу. А сусветныя рынкі працягваюць падаць: учора абрушэнне пачалося з Японіі, дзе індэкс Nikkei страціў 3,5 працэнта. Пры гэтым 16 жніўня стала адным з самых цяжкіх дзён для расійскага фінансавага рынку за паслякрызісную гісторыю: нягледзячы на моцныя фундаментальныя паказчыкі эканомікі, рынкі знаходзяцца ў свабодным падзенні.

### КАРТЭЖ ПРЭМ'ЕРА ІЗРАІЛЯ ЗБІЎ ДЗЯЎЧЫНКУ

**На пешаходным пераходзе на ўездзе ў Іерусалім адзін з аўтамабіляў картэжу прэм'ер-міністра Эхуда Ольмерта збіў дзесяцігадовую дзяўчынку, якая пераходзіла вуліцу. Яна атрымала раненні лёгкай і сярэдняй цяжкасці і некаторы час правядзе ў бальніцы.**

Паводле інфармацыі дарожнай паліцыі, картэж рухаўся пры суправаджэнні гукавых і светлавых спецсігналаў. На адным з перакрыжаванняў святло змянілася на чырвонае, але картэж не спыніўся. Дзяўчынка пачала пераходзіць дарогу на зялёнае святло, і адна з машын суправаджэння яе збіла. Гэты аўтамабіль застаўся на месцы, астатнія працягвалі шлях. На месцы здарэння застаўся таксама медык прэм'ера, які аказаў дзяўчынцы першую дапамогу. З канцылярыі Ольмерта паведамілі, што кіраўнік урада даведаўся пра інцыдэнт толькі ў сваёй рэзідэнцыі.

### РАСІЯ ЗАНЕПАКОЕНА ЯКАСЦЮ КІТАЙСКІХ ЦАЦАК

**Больш за палову імпартных цацак небяспечныя для здароўя дзяцей, і ў першую чаргу — кітайскага паходжання. Пра гэта ўчора заявіў галоўны дзяржаўны санітарны ўрач РФ Генадзь Анішчанка.**

Няякасныя цацкі ўтрымліваюць не толькі свінец, але і іншыя таксічныя рэчывы, у тым ліку фармальдэгід. Найбольшую занепакоенасць у кіраўніка Распажыўнагляду выклікае якасць цацак для немаўлят. Нагадаем, днямі гучны скандал вакол небяспечных кітайскіх цацак разгарэўся ў ЗША.

### У ЛЬВОВЕ НАЛІЧЫЛІ АМАЛЬ ТРЫ ТЫСЯЧЫ ЛЬВОЎ

Жыхары ўкраінскага Львова падлічылі ўсе скульптурныя выявы львоў, якімі ўпрыгожаны гэты горад. Усяго іх аказалася 2942, не ўлічваючы скульптуры на мясцовых Лычкаўскіх могілках, а таксама тых, што выкарыстаны ў афармленні інтэр'ераў.



### АБРАБАВАЛІ БАНКАЎСКІ РКЦ

**У Віцебску абрабавалі разлікова-касавы цэнтр філіяла № 5 «Белгазпрамбанка».**

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-цэнтры УУС Віцебскага аблвыканкама, у спецыяльны пункт Дэпартамента аховы Першамайскага раёна паступіў сігнал аб тым, што спрацавала сігналізацыя. На месцы здарэння група затрымання і следча-аператыўная група ўстанавілі, што злачынца ўзламаў дзвярныя запоры і трапіў у РКЦ, калі аператар, якая тут працуе, адсутнічала падчас перапынку. Скрадзена 450 еўра, 1965 долараў і 9940 расійскіх рублёў. Агульная страта — больш 6,2 млн рублёў. Зараз створаная аператыўная група шукае злачынцу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


УП «Минский городской центр недвижимости»

проводит открытый аукцион по предоставлению юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям во временное пользование торговых площадей в торговом центре «Купаловский»

| № лота | Номера торговых мест | Площадь торгового места, кв.м | Начальная цена кв.м, евро | Срок аренды, месяцев | Размер задатка, базовых величин |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 76 | 3,0 | 63,0 | 12 | 10 |
| 2 | 91 | 3,0 | 63,0 | 12 | 10 |
| 3 | 92 | 3,0 | 63,0 | 12 | 10 |
| 4 | 116 | 4,0 | 37,5 | 12 | 10 |

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на расчетный счет 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень необходимых документов и порядок подачи определен условиями проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Аукцион состоится 29 августа 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие принимаются по 28 августа 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Заявки на участие, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

**Контактные телефоны: 227-40-22, 227-48-36. Наш сайт в Интернете www.mgcn.by.**



ОАО «БПС-Банк»

14 августа 2007 года

**ПРОВЕЛО ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**в форме заочного голосования.**

**Собрание постановило:**

1. Увеличить уставный фонд ОАО «БПС-Банк» до 139 866 720 070 рублей путем дополнительного выпуска 77 922 077 простых (обыкновенных) акций за счет средств республиканского бюджета в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 26 июля 2007 г. № 355 «О некоторых вопросах деятельности открытого акционерного общества «Белпромстройбанк».
2. Утвердить изменения и дополнения в Устав ОАО «БПС-Банк», в том числе в связи с увеличением уставного фонда банка.
3. Утвердить решение о шестом выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «БПС-Банк».
4. Утвердить норматив расходов на оказание безвозмездной (спонсорской) помощи в размере до 0,4 % от доходов, полученных банком за 2006 год и Программу предоставления безвозмездной (спонсорской) помощи ОАО «БПС-Банк» на 2007 год.

**Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности.**


### КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.08.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 147,00 |
| 1 еўра | 2 879,66 |
| 1 латвійскі лат | 4 128,85 |
| 1 літоўскі літ | 833,56 |
| 1 чэшская крона | 104,56 |
| 1 польскі злоты | 750,63 |
| 1 расійскі рубель | 83,28 |
| 1 украінская грыўня | 429,48 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 25,7818 |
| 10 UAH | 51,2489 |
| 1000 BYR | 11,9887 |
| EUR | 34,5502 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 17.08.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2140 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.



ISSN 1990 - 763X

# СКАНВОРД З СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.




| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 5 | | |
| | | | | | 9 | | 2 | 1 |
| 2 | 9 | | | | 6 | | 8 | 3 |
| | | | 7 | 9 | | 8 | 6 | 5 |
| | | | | 6 | | | | |
| 4 | 6 | 8 | | 3 | 2 | | | |
| 8 | 7 | | 3 | | | | 5 | 4 |
| 1 | 4 | | 9 | | | | | |
| | | 9 | | | | | | |

**СУДОКУ. Аматары бавіць вольны час за шахматамі, шашкамі, іншымі настольнымі гульнямі, крыжаванкамі, сканвордамі апошнім часам атрымалі новы цікавы занятак — разгадваць судоку. Гэтая гульня-галаваломка распаўсюдзілася па свету з Японіі. У квадраце з 9 на 9 клетак трэба размясціць лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным гарызантальным радку, кожным вертыкальным слупку, а таксама ў кожным малым квадраціку 3 на 3 клеткі, абмежаваным тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.**

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## Львы праявяць сябе як геніяльныя кіраўнікі, а Шалі сустрэнуць уплывовага чалавека

**АВЕН**. Верагодна заключэнне кантракта, які будзе вельмі перспектыўным у многіх галінах і можа прывесці да паездкі за мяжу. Пры жаданні будзеце здольны максімальна выкарыстаць такія якасці, як разважлівасць і ўпэўненасць у асабістых сілах. Спатрэбіцца і дар пераканання. Панядзелак — не самы ўдалы дзень для новых спраў і сур'ёзных пачынанняў. Чацвер спрыяльны для надання вашым справам завершанасці. Не выключана набыццё новых заступнікаў і партнёраў. Прыслухайцеся да голасу вашай інтуіцыі.

**ЦЯЛЕЦ**. У першую палову тыдня вам лепш заняць пазіцыю чакання і прыгатавацца да пэўных кампрамісаў. З сярэдзіны тыдня падзеі пачнуць пераўтвараць ваша жыццё, дорачы шанц рэалізацыі творчага патэнцыялу. Рост кар'еры працягнецца, але не варта задзіраць нос і закранаць чужыя інтарэсы — ёсць небяспека апынуцца ахвярай інтрыг. Не адмаўляйцеся ад работы ў пятніцу, асабліва калі яна мяркуецца на выездзе. Ваша дзейнасць у гэты дзень будзе на рэдкасць удалай. У выхадныя дні могуць узнікнуць праблемы, калі не пачнеце клапаціцца пра сям'ю.

**БЛІЗНЯТЫ**. Тыдзень поўны розных падзей. Як ён пройдзе — залежыць ад вашага эмацыянальнага настрою і аптымізму. Больш давярайце сабе, але не прымайце хуткаспелых рашэнняў. Важна вызначыцца з дзелавымі партнёрамі: калі з некаторымі з іх вашы шляхі разыдуцца, не варта шкадаваць аб гэтым. Рэалізацыя амаль усіх ідэй вам па плячу. Калі ўпэўненасць не пакіне вас, справы пойдуць цудоўна, асабліва ў другой палове тыдня. Найбольш спрыяльным днём будзе пятніца.

**РАК**. Пажадана асцерагацца неабдуманых слоў і неасцярожных учынкаў, бо адрыў ад рэальнасці можа вельмі дорага каштаваць. Пастарайцеся не грэбаваць некаторымі ўмоўнасцямі і праявіце рашучасць у пераадоленні цяжкасцяў. Парадуйцеся поспехам блізкіх людзей — ім так неабходна ваша ўвага. Адкладзіце ў пятніцу дробныя справы, якія вас раздражняюць, і займіцеся вырашэннем больш важных праблем. Выхадныя прысвяціце адпачынку.

**ЛЕЎ**. У пачатку тыдня будзеце геніяльным кіраўніком. Прычым гэтыя здольнасці праявяцца нават у тым выпадку, калі ў вас няма ніводнага падначаленага. Вы зможаце правільна арганізаваць працоўны працэс, максімальна эфектыўна выкарыстоўваючы кожнага, хто ў яго ўцягнуты. Шкада толькі, што да канца тыдня сітуацыя карэнным чынам зменіцца і вам будзе цяжка пазбегнуць сваркі. У пятніцу можа з'явіцца неабходнасць ахапіць неахопнае, узнікне шмат дробязных пытанняў: пастарайцеся ў іх не заблытацца. Не стаўце перад сабой звышзадач, нават калі ў вас ёсць вопыт іх вырашэння. Бліжэй да выхадных вам нарэшце ўдасца выправіць адносіны з блізкімі людзьмі.

**ДЗЕВА**. На ваш светапогляд можа сур'ёзна паўплываць фінансавы аспект — магчымасць дастойна зарабляць і прымаць рашэнні аб расходах самастойна. Удача ўсміхнецца на прафесійнай ніве: аўтарытэт будзе расці не вельмі хутка, але няспынна. У сераду рызыкоўныя мерапрыемствы катэгарычна забараняюцца. У гэты дзень варта ўсвядоміць, што ўскладзеныя на вас абавязкі — не нагода скідваць назапашанае раздражненне на калег. У пятніцу для адчування паўнаты жыцця паразмаўляйце з сябрамі на філасофскія тэмы.

**ШАЛІ**. Катэгарычна проціпаказаны фанатызм у любых жыццёвых аспектах. Ведайце меру — нястрымнае імкненне да мэты, якой бы яна ні была, нічога добрага не абяцае. Лепш раскажыце блізкім людзям пра свае планы. Тым самым вы зробіце яшчэ адзін крок да іх рэалізацыі. У чацвер апоўдні стануць зразумелымі перспектывы на бліжэйшую будучыню. Наперадзе шматабяцаючыя прапановы. Але ўдача не прыплыве да вас у рукі сама — вы павінны праявіць пэўную актыўнасць. У суботу на вашым шляху можа сустрэцца ўплывовы чалавек, у якога ёсць магчымасць ажыццявіць вашу запаветную мару.

**СКАРПІЁН**. Зможаце пахваліцца рэдкім спакоем, вытрымкай, душэўнай раўнавагай. Добры час для вырашэння няпростых пытанняў, якія маюць эмацыянальную падаплёку. Час — спрыяльны для рэалізацыі творчых ідэй і задумаў, незалежна ад таго, працуеце вы ці адпачываеце. Калі ў галаву прыйдзе карысная ідэя, трэба кінуць усё і прыняцца за яе рэалізацыю. У пачатку тыдня давядзецца прысвяціць шмат сіл і часу арганізацыйным пытанням. Каб было лягчэй, сачыце за асабістай дысцыплінай і пастарайцеся нікуды не спазняцца. У пятніцу нейкая даўняя заблытаная сітуацыя завалодае вашымі думкамі і вы раптам знойдзеце доўгачаканае рашэнне.

**СТРАЛЕЦ**. Фартуна ўсміхаецца вам. Пастарайцеся ўлавіць усе аспекты таго, што адбываецца: ад вас можа спатрэбіцца хуткая рэакцыя і змена тактыкі. Падзеі будуць раптоўна змяняцца, прычым не ў лепшы бок. Вы павінны вырашыць, калі неабходна праявіць ініцыятыву і ўзяць на сябе адказнасць за прыняцце рашэнняў, а калі заняць пазіцыю чакання. Такая тактыка дапаможа дабіцца бліскучых вынікаў. Не варта даваць нагоду для плётак сваёй незацікаўленасцю. У чацвер лепш не праяўляць актыўнасць і ініцыятыву — гэтага могуць не зразумець. Выхадныя правядзіце з каханым чалавекам.

**КАЗЯРОГ**. Начальства будзе настроена да вас добразычліва: варта скарыстаць гэты момант для прыцягнення ўвагі да сваёй асобы. Магчыма, вам прапануюць новую, вельмі перспектыўную работу. У сярэдзіне тыдня верагодны невялікія камандзіроўкі. У пятніцу пастарайцеся займацца толькі тым, што вам сапраўды цікава. Гэты дзень спрыяльны для творчасці. Праявіце ўвагу да блізкіх людзей. Па магчымасці займіцеся ўмацаваннем здароўя. Будзьце больш стрыманымі ў нядзелю. Канец тыдня варта прысвяціць дробным бытавым праблемам.

**ВАДАЛЕЙ**. Настае асабліва ўдалы час для рэалізацыі дзелавых ідэй. Ваш прэстыж і рэпутацыя цалкам у вашых руках. У панядзелак лепш за ўсё засяродзіцца на доўгатэрміновых планах. Вы можаце смела глядзець у будучыню, дэманстраваць свае погляды і выказваць меркаванні — гэтыя словы і дзеянні толькі ўмацуюць ваш аўтарытэт. Ахілесавай пятой у чацвер можа стаць залішняя даверлівасць, з-за якой ёсць рызыка паўторна наступіць на адны і тыя ж граблі. У суботу шчырая размова з блізкімі людзьмі дапаможа пераадолець непаразуменне.

**РЫБЫ**. Вельмі верагодна ўдалае вырашэнне даволі заблытанай праблемы, што, у сваю чаргу, можа падштурхнуць вас да нейкага рызыкоўнага мерапрыемства. У справах пажадана не выдзяляцца, а лепш быць у згодзе з інтарэсамі калектыву. У аўторак не варта планаваць нічога новага. У сераду пачніце ажыццяўляць важны праект: калі не выкарыстаеце гэты дзень, то складана будзе навярстаць, тое, што ўпусцілі. Пятніца спрыяльная для раскрыцця творчага патэнцыялу. У гэты дзень лепш застацца дома і прысвяціць увесь вольны час сям'і — вы ацэніце ўтульнасць і цяпло свайго дома і клопат блізкіх пра вас.



*На ферме ў СВК імя Баўма Іўеўскага раёна разводзяць маралаў — вялікіх паўдзікіх аленяў, памерамі крыху менш за лася. Усяго ў гадавальніку гаспадаркі ўтрымліваецца 34 алені. Паводле слоў намесніка старшыні СВК імя Баўма Зінаіды Канецкай, разводзяць аленяў толькі для рэкрэацыйных мэтаў у рамках развіцця ў рэгіёне агратурызму.*

**Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БЕЛТА.**

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.52 | 20.34 | 14.42 |
| Віцебск — | 5.38 | 20.27 | 14.49 |
| Магілёў — | 5.42 | 20.24 | 14.42 |
| Гомель — | 5.43 | 20.16 | 14.33 |
| Гродна — | 6.08 | 21.48 | 15.40 |
| Брэст — | 6.13 | 20.44 | 14.31 |

### Месяц

***Першая квадра 21 жніўня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

### Імяніны

***Пр.*** *Дар'і, Еўдакіі, Марыі, Ноны, Сямёна;*
***К.*** *Алены, Браніславы, Ілоны, Браніслава.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА +20 — +22 °С | МАСКВА +20 — +22 °С |
| ВІЛЬНЮС +22 — +24 °С | РЫГА +21 — +23 °С |
| КІЕЎ +24 — +26 °С | С-ПЕЦЯРБУРГ +20 — +22°С |

## УСМІХНЁМСЯ!

Жонка лаецца:

— Ты мярзотнік! Нягоднік! Зараза! Прайдзісвет! Я ад цябе сыходжу! Між намі ўсё скончана! Дай мне грошы на білет, я еду да маці!

Муж працягвае ёй грошы.

— А на зваротны білет?

☺

**Калі з'явіўся посуд, які не б'ецца, сямейныя скандалы сталі больш працяглымі.**

☺

На кусце спеюць ягады, і малы Вовачка пытаецца ў старэйшага брата:

— Можна іх есці?

— А ты сарві. Калі цётка на лаўцы закрычыць, значыць яны ядомыя.

☺

**Ці ведаеце вы, што эканомная гаспадыня рэжа мяса для святочнага стала вельмі тонкімі скрылікамі. А хітры госць есць адразу па пяць.**

☺

Рабінзон Круза і Пятніца на незаселеным востраве.

— Пятніца, курыць будзеш?

— Не, кажуць, курэнне — шкодна для нашага здароўя!

— Хто кажа???



Анталогія беларускай песні

# АДЛЯТАЮЦЬ ГУСІ

У песнях застаёмся мы. І з песнямі. Таму і жыццё будуецца як песня — светлае, багатае на фарбы і мелодыі, поўнае радасці і гармоніі.

Песні Уладзіміра Будніка (28.04.1949—8.08.2007) трывала ўвайшлі ў нашу рэчаіснасць, выразна перадаючы нацыянальную адметнасць беларускага духу. У вакальных творах «Палессе», «Шумі, мой лес», «Зямля мая адзіная», «Вятры Палесся», «Маці-зямля» кампазітар таленавіта перадаў захапленне родным краем. Папулярнымі сталі яго лірычныя песні «Белая лілея», «Пах чабаровы», «Водар чаромхі», «Я зачараваная табой», «Папараць-кветка», «Каця-Кацярына», «Ксеня», «Вечаровая песня самотніцы», «Жаданае каханне» і іншыя. Яркай меладычнай выразнасцю, арганічнай знітаванасцю лірычнага і патрыятычнага вылучаецца песня «Янка Купала». Каля дваццаці вакальных твораў Уладзіміра Будніка змешчана на старонках «Звязды».

**Міхась ШАВЫРКІН.**



*СЛОВЫ Аляксандра ЛЯГЧЫЛАВА*
*МУЗЫКА Уладзіміра БУДНІКА*

*Надвая разрэжуць*
*Неба клінам гусі,*
*На зямлю жалобна*
*Кінуўшы «Бывай!»*
*Хіба гэта, мусіць,*
*Плач па Беларусі.*
*Ці сказаць хацелі:*
*«Родная, чакай!»*

***Прыпеў:***
*Можа, ўсё — так,*
*Можа быць — не,*
*Толькі свой край*
*Як жа вам не любіць.*
*Можа, ўсё — так,*
*Можа быць — не...*
*Адлятаюць гусі,*
*Толькі Беларусі не забыць.*

*Мы ляцім, як гусі,*
*Ўслед за чарадою,*
*І чамусьці верым*
*Толькі важакам.*
*І сабе мы хлусім*
*У сваёй спакусе:*
*Хто ўзляцець гатовы —*
*Крылы знойдзе сам.*
***Прыпеў.***

### ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**СКАНВОРД 15 жніўня. Па гарызанталі:** Негрыцянка. Брычка. Упадак. Ратонда. Агава. Рымар. Марс. Багна. Халат. Рада. Тырана. Кабукі. Лірыка. Гон. Анод. Барана. Кашара. Ружа. Ака. Ракако. Бланк. Ласка. Аўт. Драма. Якана. Страказа. **Па вертыкалі:** Матылёк. Табар. Рашка. Ажына. Наган. Корак. Бруд. Асадак. Пара. Аладка. Ярына. Аўра. Дама. Станс. Кукса. Мат. Кар. Люк. Барада. Аса. Камар. Рык. Валацуга. Парад. Конік. Станіна. Оптыка.

36,6°

# ХВАРОБА ПРАНІКАЕ СКРОЗЬ ШКАРЛУПІНУ

**Летась у Мінску было зарэгістравана 708 выпадкаў сальманелёзу. Гэта хвароба перадаецца бактэрыямі сальманелы, якія часцей за ўсё ўтрымліваюцца ў мясе птушкі, яйках, а таксама ў прадуктах, прыгатаваных з іх.**

Як паведаміла ўрач-эпідэміёлаг Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ленінскага раёна г. Мінска Валянціна Цвірко, узбуджальнік сальманелы вельмі каварны. Справа ў тым, што харчовыя прадукты, заражаныя мікробам, не змяняюць ні свайго знешняга выгляду, ні смакавых якасцяў. Да таго ж бактэрыі вельмі ўстойлівыя ў знешнім асяроддзі, жыццяздольнасць у пылу захоўваюць да 80 дзён, у глебе — да 137, у вадзе да пяці месяцаў.

Крыніцай заражэння нярэдка з'яўляюцца прадукты, у якіх сальманелы таксама могуць жыць вельмі доўга. Напрыклад, у саланіне і расоле яны захоўваюцца ад чатырох да васьмі месяцаў, у салёным і вэнджаным мясе — 75—80 дзён, у сметанковым масле — да двух месяцаў. У хатніх умовах можна заразіцца пры патрашэнні курэй, гусей ці ўжываючы ў ежу яйкі, заражаныя сальманеламі.

Аднак заражаныя прадукты — не адзіная прычына небяспекі. Неабходна прытрымлівацца правілаў транспарціроўкі і захоўвання мяса птушкі і мясапрадуктаў. Пры пакаёвай тэмпературы колькасць сальманел у мясе праз суткі павялічваецца ў 140 разоў. Асабліва хутка размнажаюцца мікробы ў мясным фаршы і паштэтах. Таму мяса трэба старанна правараць, а вырабы з фаршу — як след прасмажваць ці даўжэй тушыць на маленькім агні. Кавалкі мяса не павінны быць таўсцейшымі, чым 8—10 сантыметраў, бо ў больш тоўстых сальманелы пры марудлай цеплавой апрацоўцы захоўваюць сваю жыццяздольнасць. Па гэтай жа прычыне рэкамендуецца адмовіцца ад прыгатавання шашлыкоў з птушкі.

Часта да біды прыводзіць адсутнасць санітарнай культуры. Пазбегнуць заражэння не так ужо і складана. Дастаткова старанна захоўваць правілы апрацоўкі прадуктаў. Нельга карыстацца аднымі і тымі ж дошкамі і нажамі для апрацоўкі сырых і гатовых прадуктаў. Сырое мяса і яйкі трэба захоўваць у халадзільніку асобна ад прыгатаваных страў і прадуктаў. Варта памятаць, што пры захоўванні яек больш аднаго месяца сальманелы могуць пранікнуць з вонкавай абалонкі праз шкарлупіну ў жаўток. Калі такое яйка варыць усяго 4—5 мінут, мікробы не загінуць. Таму, каб засцерагчыся, пажадана варыць яйкі не менш як 10 хвілін. Купляючы мясныя і рыбныя прадукты, яйкі, не кладзіце іх у адну сумку з хлебабулачнымі вырабамі, калі апошнія не ўпакаваны ў поліэтылен.

Крыніцай заражэння можа стаць і чалавек: харчовыя прадукты, заражаныя мікробамі праз брудныя рукі (хворага ці знешне здаровага чалавека), часта з'яўляюцца прычынай вялікай колькасці захворванняў.

Асабліва ўспрымальныя да сальманелёзу дзеці. Маці, заражаная сальманелёзам, не прытрымліваючыся правілаў асабістай гігіены, можа перадаць захворванне дзіцяці пры кармленні і доглядзе. Дзеці часта заражаюцца і ад хворых равеснікаў праз інфіцыраваныя цацкі і посуд.

Памятайце: калі вы адчулі слабасць, боль у жываце, у вас павысілася тэмпература, з'явілася дыярэя, не варта займацца самалячэннем, а трэба тэрмінова звярнуцца да ўрача. Часам цячэнне сальманелёзу — з дрыжыкамі, тэмпературай, пачырваненнем у горле, кашлем — нагадвае грып. У любым выпадку звяртайцеся па медыцынскую дапамогу. Толькі ўрач на падставе лабараторных даследаванняў можа паставіць правільны дыягназ. Нялечаная ці недалечаная хвароба, нават калі яна працякае лёгка, прымае працяглы характар, знясільвае чалавека і робіць яго «хадзячай крыніцай» інфекцыі.

Крымінал, здарэнні

### АДКУЛЬ У БЕСПРАЦОЎНАЙ КУЛЯМЁТ?

У беспрацоўнай віцябчанкі 1976 года нараджэння супрацоўнікі РАУС Кастрычніцкага раёна Віцебска канфіскавалі корпус нямецкага кулямёта «МГ-40» (добра, што без затвору) часоў Вялікай Айчыннай вайны. Было ўстаноўлена, што зброю знайшоў у лесе ля вёскі Новае Сяло Лёзненскага раёна яе грамадзянскі муж. Аб гэтым паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе УУС Віцебскага аблвыканкама. Праводзіцца праверка.

### ХТО АЛЬТАНКІ ЗЛАМАЎ?

**У Бешанковіцкі РАУС па дапамогу звярнуўся ляснічы, які заявіў, што невядомы зламаў дэкаратыўныя альтанкі для адпачынку праязджаючых па дарозе Мінск—Віцебск.**

Стаялі альтанкі каля вёскі Мількавічы. Страту ацанілі амаль у паўмільёна беларускіх рублёў. Узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

## Лечаць зрэзаныя кветкі

**Ці заўважалі вы, як мяняецца настрой, калі ў пакоі стаіць букет кветак? Аказваецца, у час росту яны назапашваюць дадатную энергію. Калі зрэзаць кветку, якая распусцілася, яна дорыць гэту энергію нам і адначасова «адцягвае» на сябе адмоўную. Заўважыўшы такую асаблівасць, людзі пры дапамозе кветак навучыліся паляпшаць сваё самаадчуванне. Называецца гэты незвычайны метад лячэння флоратэрапіяй. Сёння мы раскажам, як яго прымяняць.**



Працэс кантакту з кветкамі карысны сам па сабе, бо, калі чалавек поркаецца ў іх, то атрымлівае шмат інфармацыі праз зрок, слых, нюх, дотык. Ён убірае ў сябе энергію раслін, зямлі, на якой яны растуць, вады, у якую ставіць букет.

Кожная расліна валодае сваёй асаблівай энергетыкай. Таму толькі вопытны спецыяліст можа вызначыць, якая іменна кветка патрэбная чалавеку ў кожным канкрэтным выпадку. Аднак існуюць і агульныя правілы, якія можна прымяняць пры самалячэнні.

- Лячэнне трэба пачынаць з адной зрэзанай кветкі, якая яшчэ не распусцілася, бо хворы чалавек аслаблены, і ўздзеянне на яго павінна быць паступовым.
- Кветкі не рэкамендуецца трымаць у спальні, акрамя тых выпадкаў, калі імі лечаць хворага.
- Для дасягнення лекавага эфекту кветкі ставяць на адлегласці 1 метра ад чалавека, так, каб яны ўвесь час былі ў полі зроку.
- Кветку, якая завяла, адразу ж трэба замяніць свежай.

Кветкі даюць велізарны паток інфармацыі, якая мяняе энергетычную прастору вакол нас. Гэты паток і з'яўляецца той энергіяй, якая лечыць.

### ДЫЯГНАЗ СТАВІЦЬ КОЛЕР

Прынясіце хвораму ахапак розных кветак і прапануйце адабраць тыя, якія больш адпавядаюць яго стану. Калі ён падбярэ ў букет у асноўным халодную гаму (белы, блакітны, фіялетавы колеры), значыць, справа ідзе на папраўку, а калі цёплую, асабліва чырвоныя і бардовыя кветкі, значыць, да выздараўлення яшчэ далёка.

Далей стан хворага можна карэкціраваць па саставу яго букета. Пры гэтым важным з'яўляецца не агульная колькасць кветак у ім, а суадносіны цёплых і халодных тонаў. Паступова з букета трэба выдаляць «няправільны» колер і дадаваць «правільны».

Лічыцца, што халодныя тоны звязаны з энергіяй галавы, цёплыя — з энергіяй цела, таму пры састаўленні букета памятайце: **белыя кветкі дапамагаюць справіцца з праблемамі ў псіхаэмацыянальнай сферы; жоўтыя і стракатыя — пры інфекцыйных захворваннях; чырвоныя — пры хваробах унутраных органаў.**

Лекавы букет можна скласці і самому. Напрыклад, калі ў вас падаўлены стан, «прапішыце» сабе белую кветку. Пасля таго, як настрой крыху палепшыцца, ідзіце ў кветкавы магазін і прыслухайцеся да сябе, на якія расфарбоўкі «цягне». Калі на халодныя, значыць, вы на шляху ачуньвання, а калі вока прыкаванае, напрыклад, да чырвоных ружаў, варта задумацца... і купіць белыя лілеі ці хрызантэмы.

-2433-

ХАТНІЯ НАРЫХТОЎКІ

## Салата «Цудоўная»

У 3-літровы слоік слаямі пакладзіце нарэзаныя тонкімі кружочкамі **маладыя кабачкі, агуркі, памідоры, кольцы салодкага перцу.** Прапорцыі агародніны — па жаданню. Абавязкова дадайце **2 яблыкі,** нарэзаныя дробнымі скрылікамі. Зверху — **5 зубкоў часнаку, зеляніну кропу, некалькі лістоў чорных парэчак, 0,5 ч. лыжкі сумесі з размолатых на кавамолцы лаўровага лісту, гваздзікі, насення каляндры, кропу, 3 ст. лыжкі цукру і 1 ст. лыжку солі.**

Заліце кіпенем, накрыйце накрыўкай і стэрылізуйце 35—40 хвілін. Уліце **1 ст. лыжку воцатнай эсенцыі,** закатайце. Слоік некалькі разоў страсяніце, каб добра растварыліся соль і цукар, перакуліце, ухутваць не трэба.

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

## Аматарам таматаў

Вараныя і тушаныя памідоры больш карысныя, чым свежыя. І хоць цеплавая апрацоўка крыху паніжае вітамінную каштоўнасць таматаў, яна паляпшае засваенне лікапенаў — пігментаў, якія надаюць памідорам іх спецыфічны ярка-чырвоны колер. Лікапены — вельмі моцныя антыаксіданты, якія перашкаджаюць узнікненню раку, папярэджваюць атэрасклероз і запавольваюць старэнне арганізма.

ПАДКАЗКІ БЫВАЛЫХ

## Утульнасць ствараюць дробязі

**Фатаграфіі доўгі час не лічыліся часткай інтэр'ера — ну не маглі чорна-белыя кавалачкі паперы канкурыраваць з яркімі дыванамі на ўсю сцяну. Шкада, бо гэта адна з лепшых асаблівасцяў дома. Афармленне інтэр'ера фатаграфіямі сёння становіцца адным з модных дызайнерскіх рашэнняў.**



- З фатаграфій, устаўленых у прыгожыя рамкі, можна скласці кампазіцыі і ўпрыгожыць імі любы пакой у сваім доме.
- Невялікія фатаграфіі варта размяшчаць на сцяне, да якой нішто не перашкод наблізіцца, каб можна было разгледзець кампазіцыю.
- У кампазіцыях не павінна быць паўтораў. Напрыклад, фатаграфіі ў аднолькавых рамках можна падпарадкаваць строгай геаметрыі, размясціўшы ў рад па гарызанталі ці па вертыкалі.
- Усё большую папулярнасць набывае прынцып свабоднага размяшчэння. Фармат здымкаў і афармленне рамак могуць быць самымі рознымі, адзінай павінна быць толькі тэма фатаграфій, напрыклад, летні адпачынак ці якая-небудзь сямейная падзея.
- Невялікія фотаздымкі ў рамачках можна развесіць унутры вялікай рамкі. Падобнае афармленне надае ўсёй кампазіцыі нечаканы эфект карціны.
- Буйны здымак, аформлены ў раму без паспарту, можна размясціць у свабодным праёме сцяны. Вялікую фатаграфію лепш разглядаць на адлегласці.
- Многае вызначае жанр здымкаў. Напрыклад, у гасцінай ці холе цудоўна будуць глядзецца як партрэтныя здымкі, так і мастацкія работы: удала ўвасоблены стан прыроды, кропля расы, што зіхаціць на лісце, цёмныя галіны дрэў і г.д. На кухні да месца фатаграфіі дачнага ландшафту, кветак, дэкаратыўных раслін і пладоў.

-2434-

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.227. Індэкс 63850. Зак. № 4488. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12